НАВОШТА ПТУШКАМ СВОЙ ВОСТРАЎ? 9

ЧЫМ ЗНАКАМІТАЯ ВЁСКА МОЎЧАДЗЬ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 ВЕРАСНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 184 (29806)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«АСАБІСТАЕ ЎБОК. ТОЛЬКІ НАРОД, ТОЛЬКІ ДЗЯРЖАВА!»

Самае маладое дзяржаўнае свята — Дзень народнага адзінства — 17 верасня святкавала ўся краіна. Святочныя мерапрыемствы праходзілі ў кожным населеным пункце Беларусі. А эпіцэнтрам стала «Мінск-Арэна», якая сабрала разам прадстаўнікоў розных узростаў, канфесій, прафесій і інтарэсаў, аб'яднаных светлым пачуццём любові да сваёй Радзімы і шанавання яе гісторыі. Больш за дзевяць тысяч чалавек з усёй краіны былі ўдзельнікамі маштабнага патрыятычнага форуму «Гэта НАША гісторыя». Сучаснае яркае шоу паказала асноўныя вехі беларускай гісторыі, з яе перамогамі і трагедыямі. Зоркі беларускай эстрады яшчэ раз даказалі, колькі таленавітых людзей жыве на гэтай зямлі. І ўсе — ад малога да вялікага — былі ў гэты вечар разам. Безумоўную важнасць Дня народнага адзінства для беларусаў у сваім выступленні падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Фота БелТА.

Перш чым выступаць афіцыйна, беларускі лідар папрасіў усіх прысутных ціха і вельмі ўважліва паслухаць. Ён падкрэсліў, што апошнім часам нашы людзі прос-та і будзённа ўспрымаюць цяперашнія падзеі. Па словах Прэзідэнта, з аднаго боку, так і павінна быць. «З іншага боку, вы нават не можаце сабе ўявіць, якую буру эмоцый не толькі ў нашых суседзяў, але і ва ўсім свеце выклікала абвяшчэнне ў Беларусі гэтага свята», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Калі нас падзялілі па-жывому, быў такі замес у гісторыі і каша на тэрыторыі нашай Беларусі, што не толькі гісторыкам, але і многім іншым палітолагам, юрыстам і дзяржаўным служачым давядзецца разбірацца. Нязменна адно — мы жывём на сваёй зямлі. Гэта наша зямля з тых даўніх часоў. Гэта непарушна. І мы гэту зямлю нікому не аддадзім», — заявіў Аляксандр Лукашэнка, што выклікала шквал апладысментаў з залы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Дзень народнага адзінства ў нашай гістарычнай памяці стаіць побач з дзяржаўнымі святамі Вялікай Перамогі і Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Таму што ў далёкім 1939-м ён абумовіў будучыя гераічныя здзяйсненні адзінага беларускага народа.

«Страчаную традыцыю святкаваць вызваленне заходніх беларускіх земляў мы вярнулі ў сваё жыццё не толькі як даніну памяці аб эпахальнай падзеі. Без гэтай падзеі нам было б складана гаварыць аб перамозе, не кажучы ўжо аб незалежнасці. Гэта адказ на новыя спробы Захаду падзяліць беларускі народ па жывым і разарваць на шматкі краіну. Гэта наказ будучым пакаленням беларусаў памятаць гістарычныя ўрокі», — сказаў беларускі лідар.

СТАР. 2

КАРАТКА

• **Аляксандр Лукашэнка павіншаваў кіраўніцтва, асабовы склад і ветэранаў мытнай службы Рэспублікі Беларусь з Днём мытніка.**

• У МЗС Беларусі нама інфармацыі аб забароне грамадзянам Беларусі на ўезд у Польшчу і краіны Балтыі з шэнгенскімі візамі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Юрый ЧАБАТАР, першы намеснік міністра эканомікі:

«Нягледзячы на знешні санкцыйны ціск, эканоміка пачала дэманстраваць паступовае аднаўленне. Па выніках 8 месяцаў ВУП склаў 95,1 працэнта, дадаўшы 0,3 працэнтнага пункта да студзеня — ліпеня. Ключавы ўклад у гэты прырост, як і чакалася, забяспечылі несумненныя поспехі ў сельскай гаспадарцы. Іншая, не менш важная, перадумова такой аднаўленчай дынамікі — эфектыўная работа прадпрыемстваў рэальнага сектара. У параўнанні са студзенем — ліпенем 2021 года выручка павялічылася на 10,3 працэнта, прыбытак ад рэалізацыі — на 21,9 працэнта, чысты прыбытак — на 6,5 працэнта. Характэрна, што тэмпы росту выручкі па выніках 7 месяцаў 2022 года перавышаюць тэмпы росту сабекошту на 0,9 працэнтнага пункта (110,3 працэнта і 109,4 працэнта адпаведна). Такія вынікі шмат у чым дапамаглі сфарміраваць дадатнае знешнегандлёвае сальда — больш за $2,8 млрд. Гэты прыток валюты надаў эканоміцы дадатковы запас трываласці».

На ўласныя вочы

Падарожжа з аўтакрамай

Што прывозіць «крама на колах», і каму гэта патрэбна

Заязджаючы ў вёску, аўтакрама працягла сігналіць — апавяшчае пакупнікоў аб сваім прыбыцці. І першымі на гэты гук збягаюцца навакольныя каты. Яны ведаюць, што чуллівыя бабулі купяць ім ліверкі, а можа, і сасіскі. А калі не — заўсёды можна што-небудзь сцягнуць з сумак, пакуль пакупнік будзе расплачвацца або спыніцца пагаварыць. «Супермаркет на колах» наведвае кожны населены пункт па сваім маршруце двойчы на тыдзень, і закупляюцца вяскоўцы грунтоўна.

Душэўная праца

Зрэшты, часта ў месцах прыпынку аўтакрамы пакупнікі збіраюцца загадзя. І калі па нейкіх прычынах машына крыху спазняецца, дакараюць: маўляў, чаму так доўга...

— Усіх нашых пастаянных пакупнікоў мы ведаем па імёнах і імёнах па бацьку, — кажа найстарэйшая з прадаўцоў аўтакрам Пружанскага райспажыўтаварыства Людміла Нікалайчук.

СТАР. 7

Фота Газеты ГОЛАД.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

«АСАБІСТАЕ ЎБОК. ТОЛЬКІ НАРОД, ТОЛЬКІ ДЗЯРЖАВА!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ён звярнуў увагу, што мы не можам паўплываць на той факт, што знаходзімся на скрыжаванні геапалітычных інтарэсаў вядучых дзяржаў свету. «Тут, на гэтай нашай святой беларускай зямлі, калі глядзець у гісторыю, ды і ў будучыні я гэта бачу, эпіцэнтр усіх падзей», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Мы павінны запомніць: калі мы не возьмем галаву ў рукі, у гэтым цяперашнім перадзеле свету зноў апынемся ў страшным палітыка-эканамічным замесе. Так, я яшчэ пад уражаннем ад падзеі ўчарашняга і пазаўчарашняга дня ў старажытным Самаркандзе. Там асабліва, калі сядзіш сярод кіраўнікоў дзяржаў, адчуваеш нерв эпохі. Там асабліва адчуваеш: наша зямля. Колькі б нас не было: 10, 12, 20 мільёнаў. Памерці павінны, але ж захаваць яе для сваіх дзяцей. У адваротным выпадку будзем зноў пад бізуном гарбаціцца стагоддзямі. Пакуль не складзецца сітуацыя, калі складзецца, што мы зноў станем незалежнымі. Вось у чым момант і ўрок адзін: нас не будуць штурхаць то ўлева, то ўправа, то з усходу на захад, дзяліць, рэзаць, калі мы будзем жыць на сваёй зямлі, будзем яе шанаваць, нікому не аддаваць і будзем свята захоўваць свой суверэнітэт на гэтай тэрыторыі. Асабістае ўбок, толькі народ, толькі дзяржава», — эмацыянальна выказаўся Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што ў нашых сілах зрабіць высновы з падзей мінулага, каб выстаяць і захаваць сябе як суверэнную дзяржаву.

Я хачу, каб мы беларусамі былі

Прэзідэнт звярнуў увагу на неабходнасць памятаць (без гэтага нельга) і нагадваць усім пра тое, што ў саюзе з усходнеславянскімі суседзямі беларускія землі развіваліся (Кіеўская Русь, Расійская імперыя, СССР), а ў абдымках Захаду — неаднойчы мы знаходзіліся там — амаль гінулі, загнівалі як нацыя. Па яго словах, беларусаў рабавалі, знішчалі як этнас і ў эпоху Рэчы Паспалітай, і ў перыяд 20-гадовага польскага парадку на нашых заходніх землях. Землях, якія і сёння польскія эліты называюць сваімі «Усходнімі крэсамі».

Ён нагадаў, як, не паспеўшы атрымаць літаральна «з рук» ленінскага Саўнаркама сваю дзяржаву пасля больш як 100-гадовага перапынку, польскія ўлады адразу ж прад'явілі прэтэнзіі на беларускія тэрыторыі. «З пазіцыі сённяшняга дня мы бачым непазбежнасць гэтай геапалітычнай катастрофы ў нашай гісторыі. Як пакажа пасля час, воля супрацьстаяць агрэсару ў народа была. Не было адзінства ў кіруючых колах, якія ў пачатку XX стагоддзя стаялі каля вытокаў стварэння беларускай нацыянальнай дзяржавы. Наша зямля, спустошаная германскай акупацыяй у пачатку стагоддзя, была тады напоўнена ўнутрыпалітычнымі звадамі. У 2020 годзе нам гэта хацелі падкінуць, гісторыя паўтараецца», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, як адны — мясцовыя нацыяналісты з ліку прыхільнікаў БНР — марылі пра ўладу любой цаной. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, так было і ў 2020 годзе, нашчадкі тых нацыяналістаў думалі толькі пра ўладу, як схапіць, парваць і падзяліць паміж сабой. Іншыя жылі марамі аб сусветнай рэвалюцыі. Прэзідэнт звярнуў увагу, што і ў першым, і ў другім выпадках інтарэсы нашага народа альбо адмаўляліся ў прынцыпе, альбо адсоўваліся ўбок як «несвоечасовае» пытанне.

«Нашыя інтарэсы былі несвоечасовыя. Яны ігнараваліся. Чаму? Бо мы не былі гаспадарамі на сваёй зямлі. Мы не былі суверэннымі. Нічога ў нас не было: ні дзяржавы, ні ўлады, ні зямлі не было. Таму і перакройвалася карта рэспублікі як заўгодна і кім заўгодна. Самае страшнае — без удзелу беларусаў», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

«Цана тэрытарыяльных страт — паламаныя лёсы мільёнаў беларусаў. Яшчэ жывыя тыя, чыя памяць захоўвае ўспаміны аб пакутлівых 18 гадах жыцця па розных баках мяжы, якая прайшла не толькі праз вёскі, гарады, але і праз людскія душы і сэрцы. Межы, якія падзялілі адзіны народ. Мы памятаем, як «за польскім часам» адданыя сваім традыцыям, культуры, веры і мове беларусы калі што і мелі, то горкі «сірочы» хлеб, рабскую працу, разбураныя сем'і», — звярнуў увагу Прэзідэнт. Ён з гонарам падкрэсліў, што людзі самі падняліся на барацьбу. Усталі на абарону нацыянальнай культуры, мовы, сваёй чалавечай годнасці, разгарнуўшы маштабны партызанскі рух і адплачваючыся за волю жыццямі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гісторыкі налічылі некалькі соцень буйных і дробных паўстанняў беларусаў і ўкраінцаў за амаль 20-гадовы польскі міжваенны перыяд.

«Мы памятаем тую жорсткасць, з якой было задушана Скідзельскае паўстанне, калі польскія жандары рэзалі ўсіх запар, не шкадуючы старых, жанчын і дзяцей. Памятаем дзікія катаванні, якім падвяргаліся вязні канцлагера Бяроза-Картузская. І будзем памятаць герояў, якія сталі сімваламі народнага супраціву ў Заходняй Беларусі: Сяргея Прытыцкага, Веру Харужую, дзеда Талаша, Кірыла Арлоўскага, Станіслава Ваўпшасава і іншых нашых землякоў. Мы і сёння бачым сілу і веліч непакоранага беларускага духу ў творчасці Максіма Танка, Валянціна Таўлая, Максіма Сеўрука, Рыгора Шырмы і многіх іншых. Бачым, адчуваем і памятаем», — сказаў Прэзідэнт.

«Не было б гэтага ўз'яднання, не было б аб'яднання беларускіх земляў, не было б гэтага адзінства беларускага, рускага, украінскага і іншых народаў, калі б мяжа праходзіла пад Мінскам, як мінімум Масква б не выстаяла. Як мінімум. Гэтая падзея на цэлыя два гады спыніла шалёны бліцкрыг нацыяналістычнай Германіі», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён прывёў яшчэ адзін гістарычны парадокс. Беларусы ў саюзе з іншымі савецкімі народамі не толькі перамаглі, але і, адкінуўшы ранейшыя крыўды ў 1945-м, вызвалілі Польшчу ад фашызму. Больш за 600 тысяч савецкіх воінаў, сярод іх нямала беларусаў, назаўжды засталіся ляжаць у польскай зямлі.

«І хто там, за Бугам, сёння аб гэтым успамінае? Чым нам сёння адказваюць? Картамі паляка, фэйкамі Белсата, праграмамі Каліноўскага, палітэмігранцкімі цэнтрамі, байполамі, байсоламі і іншымі ідэалагічнымі дывэрсіямі. Дадайце да таго, што на тэрыторыі гэтых дзяржаў і ва Украіне (знайшлі зручнае месца) сёння фарміруюцца сілавыя падраздзяленні для звяржэння ўлады ў Беларусі і вяртанне нас да 1939 года», — канстатаваў беларускі лідар.

«Галоўнае, каб мы памяталі свой гістарычны вопыт»

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, памяць аб героях Вялікай Айчыннай вайны, якія захавалі польскую нацыю і дзяржаўнасць, якія выратавалі Прыбалтыку і цывілізаваную Еўропу ад карычневай чумы, сёння проста сціраюць з гісторыі ўнукі і праўнукі салдат вермахта і германскіх сатэлітаў. «Паглядзіце на сённяшнія палітыкаў Еўропы і нашых суседзяў. Таты і дзядулі служылі ў фашысцкіх войсках. Вось яны сёння рвуцца сюды. Ім патрэбен рэванш», — заявіў ён.

«Вы ўспомніце, як усе лізалі пяткі фашысцкай Германіі і Гітлеру. Асабліва поўзала кіраўніцтва Польшчы. І да чаго гэта прывяло? У першыя дні верасня, на працягу двух тыдняў Польшча перастала існаваць. Вельмі шкада, што нашы суседзі не вывучылі ўрокі гісторыі. Але галоўнае, каб мы памяталі свой гістарычны вопыт, а ўнукам нашым не прыйшлося выбудоўваць нацыянальную дзяржаўнасць наноў», — сказаў Прэзідэнт,

«Усе памятаюць, чым заканчваецца нежаданне вялікіх імперый дамаўляцца. Напалеонаўскім нашэсцем, дзвюма сусветнымі войнамі і некалькімі дзясяткамі лакальных канфліктаў. І сотнямі мільёнаў жыццяў. А што сёння? ЗША штурхаюць Еўропу ў ваеннае супрацьстаянне з Расіяй на тэрыторыі Украіны. Свае планы яны не хаваюць — кантракты ўжо заключаны на гады наперад. Гэта значыць, Украіну будуць разбураць дашчэнту. І мэта пры гэтым — паслабленне Расіі і знішчэнне Беларусі», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, яшчэ адна мэта заакіянскіх гаспадароў — Еўропа. «Вашынгтон прысутнічае ва ўсіх значных палітычных канфліктах, пры гэтым цалкам ігнаруе ўнутраныя супярэчнасці на грані грамадзянскага супрацьстаяння. Я выкладаю факты. Свет страціў галаву і трашчыць па швах. Чым усё завершыцца? Усё больш задумваюцца звычайныя людзі, далёкія ад палітыкі, — чым завершыцца. З моманту заканчэння халоднай вайны чалавецтва ўпершыню аказалася на парозе ядзернага канфлікту. І ў гэтым чадзе нам яшчэ не раз давядзецца даказваць сваю нацыянальную сталасць, гатоўнасць адзіным фронтам адказваць на геапалітычныя выклікі XXI стагоддзя», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што калі тады, 100 гадоў таму ў пачатку XX стагоддзя, маладая беларуская рэспубліка не мела сілы сябе абараніць, то сёння абарону нашых спрадвечных нацыянальных межаў мы не проста абаронім — мы ўтрымаем!

«Утрымаем, таму што ў нашых жылах цячэ кроў пераможцаў і мы гатовы ўзяць у рукі зброю, каб абараніць родную зямлю. Бо ў нас моцная ўлада і моцная адзіная нацыя. Таму што мы проста жадаем жыць на сваёй зямлі, сваім розумам і гадаваць сваіх дзяцей», — заявіў Прэзідэнт.

«Спрадвечная мара беларусаў спраўдзілася»

«Паважаныя беларусы! Мы вякамі жывём на гэтай, Богам прызначанай нам, зямлі. Мы не жадаем чужога і ніколі не жадалі. Веліч і годнасць нашых продкаў заусёды абуджаліся перад любымі пагрозамі і ніколі не будаваліся на прыніжэнні суседзяў. Як я казаў — суседзі ад Бога, іх не абіраюць. Мудрасць жыцця, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне, — ні перад кім не кланяцца, жыць сваім розумам і са свайго мазаля. У Дзень народнага адзінства мы ўпэўнена кажам, што спрадвечная мара беларусаў спраўдзілася», — звярнуўся да ўсіх беларусаў Прэзідэнт.

Ён расказаў, як на саміце ШАС Прэзідэнт Казахстана высока ацаніў сказаную некалі беларускім лідарам думку. Тады Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што няхай у нейкія часы Беларусі не было, але зараз яна ёсць і з гэтым трэба лічыцца.

«Мы аб'ядналіся ў адной краіне, у адной рэспубліцы. Ад сіняй стужкі Прыпяці да званоў полацкай Сафіі. Ад Камянецкай вежы і нёманскіх хваль да велічных Дняпра і Сожа. Паходню беларускай дзяржаўнасці запалілі ў старажытным Полацкім княстве і праз стагоддзі выпрабаванняў дзякуючы сіле духу нашых продкаў адрадзілі ў Мінску. І пад светлым знакам нашага адзінства мы ўпэўнена крочым у будучыню. Так будзе заўжды! Гэта наша гісторыя», — эмацыянальна заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт павіншаваў усіх са святам, з Днём народнага адзінства. Пасля свайго выступлення кіраўнік дзяржавы разам з усёй «Мінск-Арэнай» у акружэнні дзяцей праспяваў гімн.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ нагадаў, што пакуль мы адзіныя — мы непераможныя. «І насамрэч мы ўбачылі, наколькі пасля 2020 года страпянуўся народ, наколькі мы адзін аднаго пачалі падтрымліваць, наколькі ўсе адзін аднаму дапамагаюць у рэалізацыі задум, задач, нейкіх важных рэчаў для ўсёй краіны і як у нас усё добра ладзіцца, як усё ідзе сур'ёзнымі тэмпамі», — сказаў ён. Максім Рыжанкоў звярнуў увагу, што калі людзі адзіныя, то самыя сур'ёзныя задачы вырашаюцца. У любым напрамку: сельская гаспадарка, прамысловасць. «Мы знаходзімся ва ўмовах санкцый, але людзі не сышлі ў сябе, а такой талакой пераадольваюць усе перашкоды. І, насамрэч, мы добра выглядаем у нашым развіцці з улікам усіх гэтых абмежаванняў», — адзначыў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты Прадстаўнікоў Алег ГАЙДУКЕВІЧ упэўнены, што не варта звяртаць увагу на тое, што гаворыць заходнія партнёры. Мы нікога не крыўдзім тым, што святкуем сваё свята.

«Наведваючы розныя рэгіёны краіны, як дэпутат я бачу, што людзі дзякуюць за тое, што гэты дзень нарэшце стаў святам і заняў тое месца, якое мусіў займаць у нашым календары», — адзначыў парламентарый. Ён перакананы, што гэта свята запатрабавана. «Бо сапраўднае свята — ад душы. А яно ад душы, і гэта відаць у кожным рэгіёне. Людзі разумеюць, што мы святкуем, і радуюцца гэтаму», — падкрэсліў Алег Гайдукевіч. Па яго словах, не ўсім на Захадзе падабаецца суверэнная і незалежная Беларусь. «Ім хочацца, каб мы азіраліся на кагосьці, глядзелі знізу ўверх. А мы не хочам. Мы народ, які мае права быць на роўных з любым народам свету», — канстатаваў дэпутат.

Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ звярнуў увагу, што за два гады Дзень народнага адзінства стаў агульнанародным, любімым святам. І за такі кароткі з гістарычнага пункту гледжання тэрмін набыў маштаб другога дзяржаўнага і нацыянальнага свята ў нашай краіне.

«Тут ёсць і гістарычны складнік, і сэнсавы. Заходнія вобласці заўсёды адзначалі 17 верасня, і ў беларускіх сем'ях нават ладзілі застоллі, таму што было вызваленне часткі беларускай зямлі, часткі беларускага народа з-пад прыгнёту, і ўсяго таго, што там адбывалася», — сказаў міністр.

Па словах Уладзіміра Пярцова, у нас ёсць дзень, калі людзі могуць вывесіць сцяг з акна кватэры ці дома, надзець нейкія атрыбуты з сімволікай. Міністр нават паказаў журналістам свае запінкі з беларускім сцягам. «Я заўсёды стараюся паказаць, што я беларус, грамадзянін беларускай зямлі, грамадзянін Рэспублікі Беларусь. І разам з пераважнай большасцю людзей, якія жывуць у нашай краіне, гэты дзень адзначаю», — падкрэсліў ён.

Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА звярнула ўвагу, што Дзень народнага адзінства выклікае вялікую цікавасць у моладзі. Пра гэта сведчаць шматлікія дыялогавыя пляцоўкі, якія праходзяць у Мінску. «Людзі разумеюць, што адзінства — гэта вельмі глыбокае паняцце. Людзей розных узростаў, канфесій, прафесій аб'ядноўвае любоў да сваёй Радзімы, жаданне жыць і тварыць пад мірным небам. І ў «Мінск-Арэне» мы ўбачылі гэта яшчэ раз, калі з усёй краіны прыехалі людзі з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, небаыякавыя да лёсу сваёй краіны. І самае галоўнае — яны разумеюць, што такое адзінства на мерапрыемствах і ў жыцці — гэта поспех, гэта залог нашай будучыні», — падкрэсліла яна.

Парламенцкі дзённік

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

«УСІМ СПРОБАМ ДЫСКРЭДЫТАВАЦЬ БЕЛАРУСЬ НЕАБХОДНА СУПРАЦЬДЗЕЙНІЧАЦЬ СВОЕЧАСОВА І ПРАВІЛЬНА»

Учора прайшло пасяджэнне Савета Палаты прадстаўнікоў. На ім спікер Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА расказаў аб парадку дня будучай сесіі, у прыватнасці законапраектах, якія разгледзяць дэпутаты, і звярнуў увагу на міжнароднае супрацоўніцтва.

Сёння адкрываецца чарговая, 9-я сесія парламента. Яна працягнецца амаль год, што дазволіць больш сістэмна і аператыўна прымаць важныя для краіны і людзей законапраекты, адзначыў кіраўнік ніжняй палаты. На сёння ў Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца каля 40 законапраектаў, 20 з іх ужо ўключаны ў графік работы, яны амаль падрыхтаваны для разгляду дэпутацкім корпусам.

Найперш сесія мусіць унесці важкі ўклад у забеспячэнне канстытуцыйных пераўтварэнняў:

— Ключавыя законы гэтага блока, якія рэгулююць работу органаў улады, развіццё партыйнай сістэмы, нам неабходна прыняць да канца бягучага года. Па асобных з іх у кіраўніка дзяржавы адбыліся нарады, па шэрагу іншых пройдуць у найбліжэйшы час, і неабходна, каб дэпутаты былі максімальна ўключаны ў працэс дашліфоўкі гэтых дакументаў, — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

Самую пільную ўвагу спікер прызваў аддаць прыняццю вывераных заканадаўчых рашэнняў, накіраваных на забеспячэнне рытмічнай і эфектыўнай работы эканомікі.

У рэчышчы ўстановак кіраўніка дзяржавы па супрацьдзеянні санкцыйнаму ціску і падтрымцы беларускіх суб'ектаў гаспадарання будзе весціся работа над законапраектамі па пытаннях развіцця прадпрымальніцтва, садзейнічання і стымулявання рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, аб лізінгавай дзейнасці, аб дзяржаўным прагназаванні і праграмах сацыяльна-эканамічнага развіцця. Іх унясенне чакаецца ў найбліжэйшыя месяцы.

Сярод важных кірункаў работы парламентарыяў — рэалізацыя плана па пераразмеркаванні паўнамоцтваў паміж дзяржаўнымі органамі. У шэраг галіновых законаў ужо ўнесены неабходныя змяненні, па астатніх карэкціроўка мусіць быць завершана ў найбліжэйшы перыяд.

— Перамяшчэнне акцэнтаў аб прыняцці многіх рашэнняў рэспубліканскага ўзроўню на мясцовы — гэта патрабаванне часу. І ў гэтым кантэксце дэпутатам варта дэталька прааналізаваць унесены літаральна днямі законапраект па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання. Наколькі ён забяспечыць узмацненне ролі мясцовых Саветаў дэпутатаў пры вырашэнні пытанняў рэгіянальнага значэння? Што зрабіць, каб грамадзянскія ініцыятывы надалі імпульс больш шырокаму ўдзелу насельніцтва ў кіраванні справамі дзяржавы? Ці прадугледжаны эфектыўныя формы і метады грамадскага кантролю за выкананнем канструктыўных стваральных ініцыятыў грамадзян? — заклікаў Уладзімір Андрэйчанка.

Ён праінфармаваў, што ў Палату прадстаўнікоў паступіў законапраект «Аб грамадзянстве», чакаецца праект закона «Аб амністыі».

— Гэта тыя пытанні, якія зараз маюць асаблівае гучанне, закранаюць нацыянальную бяспеку нашай дзяржавы. Таму дэпутатам варта вельмі ўважана і пільна паглядзець на іх праз прызму забеспячэння стабільнасці і спакою ў грамадстве, — удакладніў спікер.

Міжнародная абстаноўка застаецца вельмі складанай, звярнуў ён увагу прысутных, аднак, падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка, трэба працаваць не толькі з парламентарыямі і парламенцкімі аб'яднаннямі сяброўскіх нам краін, але і з заходнімі партнёрамі, забяспечваючы міжнароднае супрацоўніцтва па важных для нашай краіны пытаннях. А ўсім спробам дыскрэдытаваць Беларусь неабходна супрацьдзейнічаць своечасова і правільна.

— Для гэтага варта рэагаваць на падзеі, якія адбываюцца ў свеце, у тым ліку прымаючы звароты і заявы. Акрамя таго, на міжнародных пляцоўках сваімі дзеяннямі і аўтарытэтам неабходна пацвярджаць статус нашай краіны як мірнай дзяржавы, накіраванай на ўмацаванне даверу і прасоўванне сур'ёзных міжнародных ініцыятыў, — заклікаў кіраўнік Палаты прадстаўнікоў.

Важна ўдасканальваць узаемадзеянне з краінамі дальняй дугі праз парламенцкія аб'яднанні Лацінскай Амерыкі і Паўднёва-Усходняй Азіі. Адным з прыярытэтных кірункаў дзейнасці была і застаецца работа Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Сур'ёзную ўвагу варта ўдзяляць супрацоўніцтву з міжпарламенцкай Асамблеяй дзяржаў — удзельніц СНД.

— У кантэксце падрыхтоўкі да старшынства ў АДКБ у наступным годзе лічу, што парламентарыі мусяць пачаць актыўную работу па вылучэнні ініцыятыў, звязаных з нашым удзелам у парламенцкай асамблеі АДКБ і прыярытэтамі беларускага старшынства ў гэтай арганізацыі, — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

Алена КРАВЕЦ.

Надвор'е

ДАЖДЖЛІВА, ХОЛАДНА, ТУМАННА

Пасля супергарачай канцоўкі жніўня другая палова верасня здаецца нам залішне халоднай. Мы прывыклі грэцца ў эпоху глабальнага пацяплення, а за акном тэмпературны фон нават ніжэйшы за кліматычную норму. Вось і на гэтым тыдні будзе дажджліва, холадна і туманна, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У мінулую нядзелю да нас завітаў Балканскі цыклон Reili. Першымі яго націск адчулі жыхары паўднёва-ўсходніх раёнаў краіны. Апоўначы на панядзелак у эпіцэнтр мацных дажджоў трапіла Магілёўшчына, паўночны ўсход Мінскай і Віцебскай абласцей. Тут у начныя і ранішнія гадзіны 19 верасня выпала больш чым палова месячнай нормы ападкаў. Паводле прагнозаў сіноптыкаў, ужо ў найбліжэйшыя суткі цыклон перамесціцца на паўночны ўсход еўрапейскай тэрыторыі Расіі, і яго ўплыў на Беларусь прыкметна аслабее. Разам з тым на тэрыторыю нашай краіны пачнуць паступаць няўстойлівыя і прахалодныя паветраныя масы з паўночных шырот, у выніку чаго тэмпературны фон панізіцца.

Сёння чакаецца воблачнае з прасяненнямі надвор'е. Удзень у многіх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 11 градусаў да 16 цяпла. У сераду прагназуецца на адзін градус менш. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Ноччу тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 4 да плюс 9 градусаў, днём ад плюс 10 да 15 цяпла.

Сіноптыкі абяцаюць, што ў чацвер будзе яшчэ халадней. У гэтыя суткі ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах будзе слабы туман. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да плюс 3—9 градусаў. Удзень паветра прагрэецца толькі на 9—14 градусаў.

Паводле папярэдняга прагнозу, у пятніцу і суботу ноччу месцамі, а днём у многіх раёнах Беларусі зноў пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы туман. Мінімальная тэмпература паветра ноччу складзе плюс 3—8 градусаў, максімальная ўдзень — 9—14 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Камунальныя стасункі

ЦІ «ПАЦЯЖЭЮЦЬ» ЖЫРОЎКІ, КАЛІ ПАЦЯПЛЕЮЦЬ БАТАРЭІ?

Першы намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь ТРУБІЛА расказаў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1», ці вырастуць сумы ў жыроўках на ацяпленне.

«Вы ў жыроўках будзеце бачыць тое, што бачылі раней. У нас тарыфы на паслугі ЖКГ павышаюцца ў памеры $5 у эквіваленце, але збалансавана: з 1 студзеня і 1 ліпеня. З 1 ліпеня ў гэтым годзе павышэння не было і да канца года яно не прадугледжана», — расказаў Генадзь Трубіла.

Захад ліхаманіць — нашым суседзям даюць парады, як эканоміць на паслугах ЖКГ. Разам з тым, як запэўніла ў профільным ведамстве, у нас сітуацыя кардынальна іншая. «У нас камфортная тэмпература вызначана санітарнымі нормамі і правіламі. Ніжні парог — 18 градусаў, верхні — 24 у жылым памяшканні. Ніякіх пераглядаў не будзе. Цэны на паліва засталіся ранейшымі, таму ніякіх сур'ёзных пераўтварэнняў у частцы павышэння цаны не будзе. Але эканоміць сапраўды трэба, мы эканомім цяпло для краіны. За 1 Гкал мы плацім па тарыфе Br21,75 — гэта агульны тарыф на сённяшні дзень. Сабекошт гэтай Гкал каля Br118, астатняе даплачвае дзяржава, — адзначыў першы намеснік міністра. — Працэнт кампенсавання (затрат на ацяпленне насельніцтвам. — **Заўв. БелТА**) у сярэднім па краіне каля 20 працэнтаў. Нашы грамадзяне плацяць Br21 за 1 Гкал. Частка нашых грамадзян плаціць па эканамічна абгрунтаваных тарыфах — Br118,95. Гэта грамадзяне, у якіх знаходзіцца ва ўласнасці некалькі жылых памяшканняў, дзе зарэгістраваны прадпрыемствы, юрыдычная асоба. Гэта грамадзяне, якія не заняты ў эканоміцы».

Адна з форм дзяржаўнай падтрымкі ў Беларусі — безнаяўныя жыллёвыя субсідыі, якія прадастаўляюцца для частковай аплаты жыллёва-камунальных паслуг. «Справа ў тым, што ў нас ужо з 2016 года ўкаранёна сістэма безнаяўных жыллёвых субсідый, і ў прынцыпе кожны грамадзянін мае права на яе атрыманне, калі больш за 20 працэнтаў ад сукупнага даходу сям'і складаюць паслугі ЖКГ (і 15 працэнтаў у вёсцы). Калі гаварыць аб лічбах, то каля Br2,5 млн у гэтым годзе патрачана на прадастаўленне безнаяўных жыллёвых субсідый. Іх атрымалі 26 тысяч сем'яў. Ёсць домагаспадаркі, якія больш за Br100 на адну кватэру атрымлівалі безнаяўных жыллёвых субсідый, ім дзяржава кампенсавала розніцу ў тарыфах», — дадаў Генадзь Трубіла.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Верагоднасць рэцэсіі ў еўразоне дасягнула 80 працэнтаў

Магчымасць рэцэсіі ў еўразоне ў найбліжэйшыя 12 месяцаў дасягнула 80 працэнтаў у сувязі з пагрозай спаду эканамічнай актыўнасці на фоне энергетычнага крызісу. Пра гэта паведаміла агенцтва Bloomberg. Раней эксперты ацэньвалі верагоднасць такога надзвычай негатыўнага развіцця падзей у 60 працэнтаў. Адзначаецца, што рызыка таго, што Еўропа сутыкнецца з рэцэсіяй, зараз дасягнула самага высокага ўзроўню з лістапада 2020-га. Таксама эканамісты прагназуюць, што інфляцыя ў еўразоне дасягне рэкордных 9,6 працэнта ўжо ў чацвёртым квартале бягучага года. Надалей прагнозы таксама песімістычныя.

У Кішынёве тысячы пратэстоўцаў запатрабавалі адстаўкі прэзідэнта Малдовы

Адстаўкі прэзідэнта Маі Санду, а таксама ўрада і парламента патрабавалі звыш 6 тысяч удзельнікаў пратэсту ў Кішынёве. Аб гэтым паведаміла РІА «Навіны», спасылаючыся на прэс-службу паліцыі Малдовы. Як паведамляецца, арганізатарам акцыі супраць дзейнага ўрада стала партыя апазіцыі «Шор». Мітынгоўцы ўстанавілі ў скверы перад парламентам краіны каля 20 палатак, якія, заявіў старшыня апазіцыйнай партыі Іван Шор, прастаюць да дэмантажу існуючага рэжыму і да прызначэння датэрміновых парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў. Паводле папярэдніх звестак, удзел у пратэстах па ўсёй краіне прынялі каля 45 тысяч чалавек практычна з усіх раёнаў. Масавыя антыўрадавыя мітынгі пачаліся ў Малдавіі яшчэ ў маі. Абурэнне пратэстоўцаў выклікаюць беспрэцэдэнтнае падаражанне энерганосьбітаў і прадуктаў харчавання, падзенне ўзроўню жыцця і рэкордная інфляцыя (33,5 працэнта). Яны абвінавачваюць улады ў няздольнасці справіцца з крызісам, палітычным ціску на апанентаў і нежаданні дамовіцца з Расіяй аб больш выгадных цэнах на газ.

Звыш паўсотні чалавек сталі ахвярамі тайфуну, які абрынуўся на Японію

З-за наступстваў тайфуну «Нанмадол» пацярпелі мінімум 55 чалавек, паведаміла ТАСС са спасылкай на тэлеканал «Эн-эйч-кей». Тайфун суправаджаецца моцным ветрам і праліўнымі дажджамі. З-за разгулу стыхіі ў Японіі адмянілі звыш 800 авіярэйсаў, шэраг цягнікоў і паромаў. Адзначаюцца пашкоджанні інфраструктуры. Без электрычнасці засталіся звыш 300 тысяч дамоў на востраве Кюсю, дзе непагадзь ужо прайшла, а таксама на паўднёвым захадзе Хансю і на востраве Сікоку. Паводле прагнозаў метэаролагаў, у многіх раёнах ёсць верагоднасць павышэння ўзроўню рэк. Прадпісанне эвакуіравацца атрымалі амаль 8,4 мільёна чалавек.

СУБОТНІКІ І КАНЦЭРТЫ

У Дзень народнага адзінства ў Мінскай вобласці ладзіліся працоўныя акцыі каля памятных мясцін, прысвечаным падзеям Вялікай Айчыннай вайны і гісторыка-культурнай спадчыне. На «Лініі Сталіна» адбылася рэканструкцыя эпізоду вызвалення Заходняй Беларусі і ўз'яднання беларускага народа. Тут жа выступілі міліцэйскія кінолагі са сваімі гадаванцамі. Удзельнікаў свята частавалі салдацкай кашай.

У Барысаве адбыліся аўтапрабег і лёгкаатлетычны забег «За адзіную Беларусь», мітынг каля помніка «Ахвярам фашызму», канцэрт «Будучыня за намі!», працавалі выставачныя пляцоўкі: адукацыйная, культурная, патрыятычная, прамысловая, спартыўная, грамадская.

У Клецку зладзілі публічныя слуханні, канферэнцыю, інтэрактыўную праграму, мастацкі праект, бодзі-арт.

У Мядзеле выступілі ваеннаслужачыя 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння з Мар'інай Горкі, прайшло спартыўнае мерапрыемства «Шляхам мужнасці», урачыстасць «Беларусь — гэта мы!». Наведнікаў збіралі тэматычныя пляцоўкі: «Каравайная», «Ураджайная», «Тэхнічная», «Літаратурная», «Забава», «Гандлёвая плошча», дзе можна было папоўніць багаж ведаў, перакусіць, набыць неабходную прадукцыю.

ПАДВОЙНАЕ СВЯТА

На Віцебшчыне Дзень народнага адзінства адсвяткавалі разам з абласнымі «Дажынкамі». Дата 17 верасня для правядзення галоўнага свята хлебаробаў была абрана кіраўніцтвам рэгіёна невыпадкова.

«У сінтэзе гэтых дат адлюстраваны наша мінулае і сучаснасць, ратны подзвіг і працоўныя дасягненні, найлепшыя рысы нацыянальнага характару і багатыя духоўныя традыцыі. А яшчэ — права быць гаспадарамі на сваёй зямлі», — адзначыў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.**

З вясны і да першых дзён верасня аграрыі Віцебшчыны рупліва фарміравалі каравай вобласці і краіны і па выніках гэтага жніва ўстанавілі новы рэкорд — перасягнулі мільённы намалот. Спачатку ўдзельнікі свята ўсклалі кветкі на мемарыяльным комплексе «Барок». Пасля ў Глыбокім адкрылі шэраг сацыяльна значных аб'ектаў: амфітэатр, басейн у раённым фізкультурна-аздараўленчым цэнтры, абноўлены будынак разлікова-касавага цэнтра філіяла «Энергазбыт».

У той жа час у Віцебску на плошчы Перамогі праходзіла будаўнічая выстава-фестываль «Майстар фэст — 2022». Актывісты Кастрычніцкага раёна Віцебска заклалі ў парку Партызанскай славы імя Міная Піліпавіча Шмырова алею адзінства са 160 маладых дрэўцаў шаравіднай туі і 55 кустоў спірэі.

У Оршы адкрылі скульптурную кампазіцыю «Сям'я — аснова міру»: яна ўвасабляе фігуры бацькоў з дзецьмі, якія трымаюць на далонях зямны шар, над сям'ёй кружаць галубы. У кампазіцыі закладзены ідэі міру і сямейных каштоўнасцяў.

УШАНАВАННЕ ГЕРОЯЎ

Мерапрыемствы, прысвечаныя святу, пачаліся ў Брэсце на пляцоўцы ў цэнтральным гарадскім парку, дзе ў брацкай магіле пахаваныя чырвонаармейцы, якія загінулі ў верасні 1939 года. У гэтай жа магіле знайшлі спачын воіны, якія вызвалялі Брэст і загінулі ў 1944—1945 гадах. У Дзень народнага адзінства найперш ушанавалі іх памяць. Дарэчы, да свята помнік быў істотна абноўлены. Старыя гранітныя плиты памянялі на новыя, асобныя элементы пафарбавалі, пачысцілі, правялі добраўпарадкаванне.

Фота БелТА.

«Для брастаўчан 17 верасня — дзень асаблівы, — сказаў **старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.** — У 1939 годзе Брэст аказаўся ў цэнтры складаных палітычных працэсаў. А 83 гады таму на гэтым месцы былі пахаваны воіны, якія аддалі жыццё за адзінства беларусаў. Дзякуючы гэтаму адзінству нашы продкі перамаглі ў Вялікай Айчыннай вайне. На гэтым месцы знайшлі спачын 73 вайскоўцы, у тым ліку 10 Герояў Савецкага Саюза.

У святочны дзень у знакавае для горада месца прыйшло нямала гараджан: прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, моладзь і ветэраны, шматлікія госці. У іх ліку быў грамадскі дзеяч, паралімпіец Аляксей Талай. Ён перадаў Аляксандру Рагачуку зліткі, выраблены з сабраных беларусамі манет у памяць пра тых, чые лёсы пакалечыла вайна.

«Зліткі будуць перададзены на захаванне ў Брэсцкую крэпасць. Хутка пачнецца рэалізацыя другой часткі агульнанацыянальнага праекта «Жывая памяць удзячных пакаленняў» — установка помніка ў Брэсце. Яго фінансаванне — народнае. Таму праект паслужыць адзінству тысяч і мільёнаў людзей, што асабліва важна зараз», — падкрэсліў Аляксей Талай.

Аляксандр Рагачук у сваю чаргу запэўніў, што брастаўчане падтрымаюць гэты цікавы праект, і неўзабаве мы ўсе ўбачым яго матэрыяльнае ўвасабленне. Такі знак установлены ў Мінску ў парку Перамогі. Частку зліткаў з манет пакінулі для помніка ў Брэсце. Хутка будзе аб'яўлены збор сродкаў. Сем'і змогуць прынесці манеты ў Брэсцкую крэпасць, у школы, іншыя ўстановы, каб паўдзельнічаць у агульнай справе. Пункты збору, дарэчы, будуць адкрытыя ва ўсіх абласцях, а таксама ў Пасольстве Беларусі ў Расіі.

А цэнтрам святкавання Дня народнага адзінства на Брэстчыне стаў на гэты раз Пінск. Свята супала з Днём горада на Піне, днём яго 925-годдзя.

НОВЫЯ ІМЁНЫ

У Гродне 10 школ і гімназій атрымалі імёны людзей, жыццё альбо подзвіг якіх звязаны з Беларуссю. Гэта традыцыя нарадзілася год таму, калі краіна ўпершыню адзначала Дзень народнага адзінства. Сёлета яна працягнута.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў урачыстага мітынгу, **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК** адзначыў важнасць аднаго з галоўных дзяржаўных свят — Дня народнага адзінства.

«З'яўленне даты 17 верасня ў нашым святочным календары стала яркім прыкладам захавання гістарычнай памяці, знакам вялікай павагі і ўдзячнасці нашым продкам, якія аб'ядналі беларускі народ. Вялікае бачыцца на адлегласці. 17 верасня — гэта найважнейшы рубікон. Пераадолеўшы яго, наш народ рэалізаваў сваё спрадвечнае права жыць разам на сваёй зямлі. Гэта эпахальная падзея стала праявай найвышэйшай справядлівасці. Напамін нам і нашчадкам аб ваенных і працоўных подзвігах нашага народа», — сказаў Уладзімір Каранік.

Падчас урачыстай цырымоніі кіраўнік рэгіёна ўручыў пасведчанні дырэктарам 10 школ і гімназій Гродна, якім прысвоены імёны людзей, чыё жыццё можа служыць прыкладам. У ліку славутых імёнаў — Герой Савецкага Саюза Агідзіл Сухамбаеў. Ён вызваляў Гродна і загінуў ва ўзросце 23 гадоў. Сярэдняя школа № 16 знаходзіцца на вуліцы, якая носіць імя героя, доўгі час тут збіралі аб ім матэрыял і вялі перапіску з яго роднымі з Казахстана. Школы горада атрымалі імёны маршала Васіля Сакалоўскага і падпольшчыцы Вольгі Соламавай.

Не толькі ваенныя дзеячы ўвекавечаны ў назвах устаноў адукацыі. Гімназіі № 5 прысвоена імя беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча. Сярэдняя школа

№ 13 цяпер носіць імя першага дырэктара, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Уладзіміра Цабо, які ўзначальваў яе з 1957 да 1965 года. Імя Мітрапаліта Філарэта прысвоена гімназіі № 10.

АСАБЛІВАЯ ЎВАГА — МОЛАДЗІ

У Гомелі цэнтральныя мерапрыемствы свята адбыліся ў вайсковай часці 5525. На пляцы сабраліся вайскоўцы, выхаванцы ваенна-патрыятычнага клуба «Лазурыт», курсанты МНС, ваенна-транспартнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту, ваеннай кафедры Гомельскага медуніверсітэта, вучні СШ № 57 Гомеля.

«Сёння мы адзначаем новае, але такое важнае свята ў лёсе беларускага народа — Дзень народнага адзінства», — звярнуўся да ўдзельнікаў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.** — Мы свята шануем сваю гісторыю. Мы ганарымся кожнай яе старонкай. Мы памятаем, колькі людзей, у тым ліку мірнага насельніцтва, загінула ў гады Вялікай Айчыннай вайны, абараняючы наш суверэнітэт. Мы не толькі памятаем, а і прымаем эстафету абаронцаў незалежнасці і міру на нашай зямлі. І тое, што ў краіне ствараюцца ваенна-патрыятычныя клубы менавіта на базе вайсковых частак, — яркае таму пацвярджэнне. У такіх клубах моладзь асвойвае навыкі ваеннага жыцця, вывучае асновы медыцынскай падрыхтоўкі, а таксама расце духоўна, наведваючы гераічныя месцы, знаёмячыся з біяграфіяй герояў».

Пасля ўрачыстай часткі падзеі разгарнуліся на стадыёне вайсковай часці. Паказальныя выступленні прадставілі выхаванцы клуба «Лазурыт», ваеннаслужачыя — спецназ, кінолагі, сапёры.

У той жа дзень больш як 250 чалавек сталі ўдзельнікамі аўтапрабегу ў Гомелі: больш за 60 аўтамабіляў стартавалі ад галоўнай плошчы, праехалі па вуліцах Пралетарскай і Ільіча і фінішавалі каля мемарыяльнага комплексу «Партызанская крынічка». Пазней ад плошчы Леніна стартаваў велапрабег «У адзінстве — сіла». Ягоны маршрут прайшоў па вуліцах Савецкай, Хатаевіча, праз Усходні абход да Лядовага палаца.

СТАМЕТРОВЫ НАДПІС І ТАЛАКОЮ ДА СТАЛА

Дню народнага адзінства ў Магілёве папярэднічаў шэраг розных мерапрыемстваў: пачынаючы ад круглых сталоў і дыялогавых пляцовак да выстаў, флэшмобаў і аўтапрабегаў.

Адной з яркіх падзей стаў урачысты канцэрт у Палацы вобласці з удзелам вядучых беларускіх артыстаў. У сваім віншавальным слове **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** адзначыў, што ў самыя складаныя часы народ нашай краіны аб'ядноўваўся і мужна пераносіў усе нягоды. І сённяшнія выклікі не павінны зламаць беларусаў. Таму сёння як ніколі важна быць разам. У раёнах вобласці адбыліся велапрабегі, у Чавусах — крос, у Магілёве — аўтапрабег. У аграгарадку Дашкаўка пасадзілі каштанавую алею.

Відовішчным атрымаўся флэшмоб на ўзлётна-пасадачнай паласе магілёўскага аэраклуба ў раёне Пашкава. Каля 100 адзінак рознай аўтатэхнікі выстраілася такім чынам, што на працягу больш за 100 метраў атрымаўся надпіс «Мы — адзіныя. Магілёў». Кадэты разгарнулі вялікае палотнішча дзяржаўнага сцяга. А лётчыкі прадэманстравалі фігуры высокага пілатажу.

Маштабныя святочныя мерапрыемствы прайшлі ў Камсамольскім скверы і на плошчы Адзінства ў Магілёве. У рамках выстаўкі «Скарбы Беларусі» былі прадстаўлены экспазіцыі пра беларускую гісторыю, спадчыну і сучаснасць. Наведвальнікі змаглі даведацца, якія падзеі адбыліся 17 верасня 1939 года і якое яны маюць значэнне для Беларусі. Не меншую цікавасць уяўляў блок беларускіх рамёстваў і традыцый. Унікнуць у тэму дапамагалі майстры, якія ладзілі пазнавальныя майстар-класы. Акрамя гэтага, выстава дэманстравала модныя сярод моладзі напрамкі дзейнасці.

Шматлюдна было на тэатралізаваным свяце «Талакою да стала», дзе для ўсіх ахвотных праводзіліся майстар-класы па выпечцы дранікаў, квашанні капусты, прыгатаванні традыцыйных беларускіх страў.

Шмат станоўчых эмоцый падарылі канцэрт дзіцячых творчых калектываў Магілёва «Шчаслівае дзяцінства пад крыламі адзінства!» і прэзентацыя-дэфіле нацыянальных касцюмаў «Моднае — народнае!», падчас якой прадстаўніцы Беларускага саюза жанчын з валошкамі ў руках прадэманстравалі беларускія касцюмы. Тэма адзінства гучала ў канцэрце на галоўнай сцэне на плошчы Адзінства, у арт-інсталяцыях, якія былі выстаўлены ў Камсамольскім скверы. Працавалі інтэрактыўная літаратурна-творчая пляцоўка «Галерэя талентаў», выставы фатаграфій і дзіцячых мастацкіх работ, шматлікія фотазоны, рамесныя і гандлёвыя рады. Як адзначалі арганізатары, суботнія гулянні былі падрыхтаваны такім чынам, каб падкрэсліць, што мы аб'яднаныя адзінай гісторыяй і культурай.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Маргарыта УШКЕВІЧ, Святлана ЯСКЕВІЧ. Фота БелТА.

ДАПАМОЖНІК ПА ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ

У «Светачы» прэзентавалі «Адзінства непераможнага народа»

17 верасня, у Дзень народнага адзінства, у кнігарні ААТ «Белкніга» па праспекце Пераможцаў, 11 беларускай сталіцы прайшла прэзентацыя філакартычнага альбома Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА «Адзінства непераможнага народа». Кніга, якая пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь пабачыла свет зусім нядаўна, стала выдатным падарункам да дзяржаўнага свята.

Гендырэктар ААТ «Белкніга» Уладзімір МАТУСЕВІЧ.

Пра гэта на прэзентацыі гаварылі **старшыня Беларускага саюза журналістаў, кіраўнік інфармацыйнага агенцтва «Мінск-Навіны» Андрэй КРЫВАШЭЕЎ, генеральны дырэктар ААТ «Белкніга» Уладзімір МАТУСЕВІЧ, першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ, паэты і празаікі Міхась ПАЗНЯКОЎ, Уладзімір МАЗГО, Іна ФРАЛОВА, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, народны артыст Рэспублікі Беларусь Эдуард ХАНОК,** іншыя ўдзельнікі святочнай імпрэзы.

На прэзентацыю ў «Светач» завіталі навучэнцы Мінскага педагагічнага каледжа, актывісты БРСМ ВНУ сталіцы. Андрэй Крывашэеў звярнуў асаблівую ўвагу прысутных на тое, што ў суседняй Польшчы забыліся на той выразны здзек, які адбываўся ў дачыненні да карэннага насельніцтва Заходняй Беларусі ў 1920—1930-я гады, расказаў пра фэйкі і абсалютны падман, які стараюцца ўкараняць у свядомасць не толькі сваіх грамадзян польскія ўлады. Важную ролю адыгрывае пры гэтым падзвіжніцтва сапраўдных гісторыкаў, сапраўдных экспертаў і публіцыстаў, якія ёсць нават і ў Польшчы. Яны выбіраюць праўду, імкнуцца выкараняць падман і палітычную хлусню.

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч расказаў пра сістэмныя падыходы Міністэрства інфармацыі нашай краіны ў рэалізацыі творчага асветніцкага праекта «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага», у рамках якога рэалізоўваюцца многія ініцыятывы і калекцыянера, лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі « За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава. Выдадзеная ў Выдавецкім доме «Звязда» кніга «Адзінства непераможнага народа» ўжо разыходзіцца па ўсёй нашай краіне. Унікальны філакартычны альбом, гартаючы старонкі якога ёсць магчымасць ажыццявіць віртуальнае падарожжа ў 1920—1930-я гады ў многія куточкі Заходняй Беларусі, можна набыць літаральна ва ўсіх крамах ААТ «Белкніга» не толькі ў Мінску, але і на Віцебшчыне, Берасцейшчыне, Гродзеншчыне, у іншых абласцях Беларусі. З кнігай можна прыйсці на школьны ўрок гісторыі, наладзіць добры ўрок патрыятычнага выхавання.

Гендырэктар «Белкнігі» Уладзімір Матусевіч запрасіў літаратараў, публіцыстаў краіны часцей завітваць у кнігарні, зрабіць іх творчымі дыялогавымі пляцоўкамі, звярнуць увагу шараговых наведвальнікаў, пакупнікоў на тое, што на паліцах знаходзіцца мноства кніг, якія паказваюць гісторыю нашай Айчыны, адлюстроўваюць яе ключавыя этапы на добрым мастацкім узроўні. Аўтарамі з'яўляюцца публіцысты, палітолагі, якія працуюць у Выдавецкім доме «Беларусь сегодня», іншых айчынных дзяржаўных масмедыя: Андрэй Мукавозчык, Ігар Тур, Людміла Гладкая, Юрый Церах...

Міхась Пазнякоў, вядомы паэт, празаік, публіцыст, перакладчык, нагадаў пра вартасці інтэрнацыянальнага выхавання. Пісьменнік расказаў пра сваю працу над перакладам славутай эпапеі Мухтара Аўэзава, прысвечанай пачынальніку сучаснай казахскай нацыянальнай літаратуры, легендарнаму асветніку Абаю Кунанбаеву. І, вядома ж, Міхась Паўлавіч прачытаў свае вершы высокага грамадзянскага гучання.

Вось якімі ўражаннямі ад прэзентацыі падзялілася першы намеснік старшыні СП Беларусі, вядомы ў краіне дзіцячы пісьменнік, публіцыст і краязнаўца Алена Стэльмах:

— 17 верасня як Дзень народнага адзінства з'ядноўвае, злучае нас у адну грамадскую, адну агульную ўсенародную кагорту. Мы — моцная краіна. Найперш таму, што здольныя на чале са сваім Прэзідэнтам Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам вытрымаць многія знешнепалітычныя ціскі. Такія кнігі, як «Адзінства непераможнага народа», — гэта адлюстраванне пераемнасці традыцый, пераемнасці сапраўднай гісторыі, асэнсаванне еднасці пакаленняў.

...Падсумоўваючы сустрэчу ў «Светачы», Алесь Карлюкевіч сказаў, што праект «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага» будзе прадоўжаны ў Выдавецкім доме «Звязда» і надалей. Уладзімір Ліхадзедаў рыхтуе да выдання новы філакартычны альбом, у якім збіраецца прадставіць шырокаму колу чытачоў свае гісторыка-культурныя знаходкі. Кніга пабачыць свет у пярэдадзень Мінскай міжнароднай выстаўкі-кірмашу на пачатку 2023 года.

Кастусь ЛЕШНІЦА. Фота Лізаветы ГОЛАД.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИНФОРМАЦИЯ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор электронных торгов	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ГЛХУ «Березинский лесхоз», Минская обл., г. Березино, ул. Пролетарская, д. 96, тел. +375 1715 66 888**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов: транспортные средства, спецтехника, бывшие в употреблении, расположенный по адресу: Минская обл., г. Березино, ул. Пролетарская, д. 96

Лот №	Инв. номер	Наименование	Начальная цена, с НДС, бел. руб.
1	01240106	**Машина транспортно-погрузочная «Беларус» МПТ – 461.1**, рег. знак ОК – 5 2008, 2012 г. в.	19 980,00
2	01240100	**Машина транспортно-погрузочная «Беларус» МПТ – 461.1**, рег. знак ОК – 5 2007, 2012 г. в.	19 980,00
3	01240128	**Трактор «Беларус» 82.1**, рег. знак ОМ – 5 8432, 2010 г. в.	12 360,00
4	01150033	**Бортовая платформа с дубль-кабиной и тентом UAZ 390945**, рег. знак ОА 5334-5, 2010 г. в.	5 040,00
5	01151263	**Бортовая платформа с дубль-кабиной и тентом UAZ 39094**, рег. знак АА 2969-5, 2005 г. в.	2 760,00
6	01250019	**Седельный тягач MAZ-6422A8-332**, рег. знак АМ 8168-5, 2013 г. в.	9 319,42
7	01150015	**Грузопассажирский фургон UAZ 390995-360**, рег. знак 4839 IP-5, 2012 г. в.	6 360,00
8	01250034	**Бортовая платформа с дубль-кабиной и тентом UAZ 390945-330**, рег. знак ОА 5352-5, 2010 г. в.	5 040,00
9	01240133	**Трактор трелевочный «Беларус»-ТТР-401М**, рег. знак ОМ-5 8443, 2010 г. в.	14 640,00
10	01240055	**Автопогрузчик вилочный «Амкодор» 451А**, 2011 г. в.	9 060,00

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390. **Срок внесения задатка – по 06.10.2022 г.**

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 07.10.2022.

Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **06.10.2022** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by) от 20.09.2022 г.

Контактные телефоны: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ООО «АСБ Лизинг».

Аукцион состоится **21.10.2022 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1: изолированное помещение №1 здания строительного рынка с инв. № 600/D-83134, 1379,9 кв. м.

Адрес: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, 14/1-1, район аг. Озерцо.

Обременения – аренда.

Начальная цена с НДС – 1 103 000,00 руб.
Задаток – 50 000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – **ino.by.** Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – **19.10.2022 в 11.00.**

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «ИЗОСПАН»

(УНП 812000699, г. Минск, ул. Мельникайте, д. 2, оф. 2001 (помещение 1)),

находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

Дата и время проведения торгов: 21 октября 2022 года.

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 20 сентября 2022 года по 19 октября 2022 года.

Место проведения торгов: г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ООО «ИЗОСПАН» (УНП 812000699)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 10 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайтах http://bankrot.gov.by/ и http://www.specrealization.by/. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

УНП 201028245

Брестский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества, принадлежащего
РУП «Брестское отделение Бел. ж. д.»

Наименование и местоположение объекта

ЛОТ: право заключения договора аренды имущества:
1) Капитальное строение с инв. № 100/С-27639 (наименование: гаражи; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта), площадью 245,8 кв. м, составные части и принадлежности: уборная, покрытие, забор, забор, забор, ворота, калитка.
2) Капитальное строение с инв. № 100/С-41749 (наименование: гараж; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта), площадью 55,9 кв. м.
3) Капитальное строение с инв. № 100/С-27644 (наименование: сарай; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 73,7 кв. м.
4) Капитальное строение с инв. № 100/С-27640 (наименование: склад ГСМ; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 26,6 кв. м.

Все объекты расположены по адресу:
Брестская обл., г. Брест, ул. Скрипникова, 7

Начальная цена продажи, руб.	1 875,90
Срок договора аренды	пять лет

Организатор аукциона: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», 224005, г. Брест, ул. Наганова, 10-329, 80162 40 87 01

Аукцион состоится 11 октября 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/auction/11338)

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ»-управляющая компания холдинга» (Продавец)

Аукцион состоится 14.10.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1, состав:

1. Ремонтно-механическая мастерская с инв. № 602/С-22089, 497,4 кв. м.
2. Растворно-бетонный узел с инв. № 602/С-22090, 242,3 кв. м.
3. Склад на 1000 т вяжущего с инв. № 602/С-22087, 291,9 кв. м.

Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г.п. Правдинский, ул. Зелёная, 53В, 51А/1, 51А.

Обременение: аренда (подробно на сайте ino.by).

Земельные участки:
1. 624455500001000303, 0,3460 га, право аренды;
2. 624455500001000304, 0,3413 га, право аренды.

Начальная цена с НДС – 16 753,21 бел. руб.
Задаток – 1 675,32 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – **ino.by.** Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатков – **12.10.2022 в 11.00.**

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ЗАО «БелБанкротАукцион»,
организатор торгов по продаже имущества ОАО «Телеханский завод столярных изделий» (УНП 200099487),
объявляет о проведении **04.10.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/09/spisok-imushhestva-telehanskij-zsi.pdf

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375(29) 254-53-88.

Продавец: ОАО «Телеханский завод столярных изделий».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **03.10.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **20.09.2022** по 17.00 **03.10.2022** организатором торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 653,34 бел. руб., за публикацию в СМИ – 1646,15 бел. руб., стоимость размещения объявления в журнале «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие» согласно счету-фактуре, стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре, за оценку 700,07 бел. руб. с НДС пропорционально по каждому лоту; аукционный сбор: 7 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 5 рабочих дней с даты проведения электронных торгов.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 30 календарных дней с даты проведения электронных торгов.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона) информирует
о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества КУП «Миноблавтосервис» (Продавец)

Аукцион состоится 04.10.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Лот № 1: автобус вагон ГОЛАЗ – 52911, кузов (рама) № VS2K4X20001848408.

Начальная цена с НДС – 44 752,97 руб.
Местонахождение: г. Минск, ул. П. Бровки, 27.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by,** Минского областного исполнительного комитета **minsk-region.gov.by** и Организатора аукциона ino.by.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Гродно 11 октября 2022 года

№ лота	Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения	Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб.	Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб.	Сумма задатка, руб.
1*	**Гродненская область, г. Гродно, ул. Просторная, 26 (У-159, микрорайон «Барановичи-9»), 440100000003005910**	0,0994	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение. Фундамент: бетон; наружные стены: блоки газосиликатные; наружная площадь (площадь застройки): 81 (81) кв. м	346,75	27 423,26 (8 149,60; 19 273,66)	5 400

** – Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр. и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения в течение 10 рабочих дней; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «ГАГРЭК» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; в установленный срок продолжить строительство жилого дома. Затраты на организацию и проведение аукциона рассчитываются исходя из фактических затрат и доводятся до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись.*

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом; документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится 11 октября 2022 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 22 сентября по 05 октября 2022 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактные телефоны:
+375 (152) 626055, 626056. http://gcn.by,
telegram-канал: https://t.me/grodno_cn

Падарожжа з аўтакрамай

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Дык іх жа чалавек сто ў кожнага прадаўца!

— Больш. Чалавек 120... У мяне на маршруце ёсць вёска Обеч, прыязджаю туды ў пачатку лета, пакупнікі пытаюцца: чаго, маўляў, так доўга ў папярэдняй па маршруце вёсцы стаялі? Кажу, папрыязджалі туды людзі. «А хто?» Пачынаю пералічваць, па-вулічнаму, як у вёсцы каго называюць. А яны: «Ты што, у нас ужэ жывэш?» — усміхаецца суразмоўца.

Не так даўно Пружанскае райспажыўтаварыства вырашыла «памяняць» прадаўцоў маршрутамі. Маршруты нераўназначныя: дзесьці пакупнікоў больш, дзесьці — менш, а ў прадаўца заробак фарміруецца зыходзячы з тавараабароту. Таму было вырашана перыядычна мяняць месцамі прадаўцоў на маршрутах і такім чынам выраўноўваць іх даходы. Але не прайшло і тыдня, як вал званкоў пакупнікоў... прымусіў вярнуць аднойчы заведзены парадак.

Людзі прывыкаюць да «сваіх» прадаўцоў, кажа дырэктар філіяла «Колас» Пружанскага райспажыўтаварыства Алена Старко. Прадаўцы таксама прывыкаюць да «сваіх» пакупнікоў. Кажуць, не надта проста сысці з аўтакрамы, хоць праца сапраўды цяжкая. Алена Мікалаеўна ўзначальвае філіял «Колас» (у яе падначаленні пяць аўтакрам, сфера адказнасці якіх — 136 населеных пунктаў) з 2013 года. І ўсе яе прадаўцы працуюць у аўтакрамах ужо шмат гадоў.

— Чатыры гады я працавала ў краме, але мне не падабалася праца ў горадзе, — распавядае прадавец Дар'я Вольска. — Патэлефанавала па аб'яве. На свой дзень нараджэння прыйшла прымаць аўтакраму. І вось я тут ужо восем гадоў.

— Я адзін раз адсюль звольнілася, — кажа Аксана Ліпніцкая. — Тады ў Пружанах толькі адкрыўся «Еўраопт», пайшла туды працаваць. Хапіла мяне на паўгода, і я вярнулася ў родны «Колас», за прылавак аўтакрамы.

Тут, тлумачыць Аксана, яна больш чым дзесяць гадоў таму пазнаёмілася з мужам: працавала ў аўтакраме, а ён прыйшоў на склад грузчыкам. А яшчэ тут праца... душэўная. «Свае» бабулечкі і дзядулі, якія чакаюць прыезду аўтакрамы. І дзякуючы ім супрацоўнікі адчуваюць, што робяць сапраўды важную, патрэбную людзям справу.

«ТУТ МАЯ ХАТКА, ТУТ Я І БУДУ»

У 8 раніцы аўтакрамы Пружанскага райспажыўтаварыства загружаюцца на складзе. Тут — свайго роду «прафесійны клуб»: прадаўцы і вадзіцелі дзеляцца навінамі, абмяркоўваюць, што адбылося за папярэдні працоўны дзень. Выехаўшы з варот склада ў 9 раніцы, вяртаюцца ў горад звычайна гадзін у 9 вечара, а часам і пазней.

— Ну, не кожны дзень мы так позна прыязджаем. У суботу — часам у 6 гадзін вечара, — кажа Дар'я. — Летам, калі шмат дачнікаў, бывае, вядома, заканчваем і ў адзінаццаць.

З 241 населенага пункта Пружанскага раёна крамы ёсць у 49. Гандлёвым абслугоўваннем астатніх — а гэта 164 сельскія населеныя пункты, або 4659 чалавек, або 10,9 % ад агульнай колькасці жыхароў раёна, — займаецца сем аўтакрам. Прычым траціна з гэтых

Прадавец 6 разраду Людміла НЕСЦЯРОВІЧ.

164 населеных пунктаў — вёскі з насельніцтвам менш за 10 чалавек.

— Значыць, у мяне сёння так: дзве Сяменчы (Сяменча-1 і Сяменча-2, яны праз дарогу), Забалацце, Рапяхі, Вінец, Задвараны, Тулоўшчына, Загор'е, Бортнавічы, Доўгае, Круглае, Алішэвічы, Куплін, — пералічвае прадавец Алена Радзівончык. — Гэта мала, у аўторак будзе больш. Па аўторках мы яшчэ заязджаем на хутар Ляхі, там жывуць бабуля і дзядуля, ім пад 90. Потым едзем так: Шакуны, Сярэдняе, Засімы, Паддубна, Жабін, Ліб'е, Харкі і Сасноўка. А ў суботу ў мяне дадаецца яшчэ тры вёскі... Ужо тры гады працую на гэтым маршруце.

Брэсцкае Палессе — гэта вялікія адлегласці паміж вёскамі, раскіданыя сярод лясоў хутары, куды не вельмі і дабярэшся ў восеньскую або вясновую бездараж. І, як усюды, гэта старое насельніцтва невялікіх населеных пунктаў. У маленькіх вёсках, дзе адкрываць нават маленечкую краму эканамічна нявыгадна, аўтакрама для пажылых людзей — не толькі забеспячэнне прадуктамі харчавання і неабходнымі рэчамі (прадаўцы прымаюць ад насельніцтва заказы і прывозяць пенсіянерам з горада тавары прамысловай групы). Па сутнасці, гэта адзіная сувязь з цывілізацыяй.

— У нас бабуля жыла ў Гарадняне, ёй 87 гадоў было, — успамінаюць прадаўцы. — Яна выходзіла да аўтакрамы з веласіпедам. Здаецца, і дзеці ў яе, і ўнукі, але рэдка да яе прыязджалі.

Адна на хутары яна жыла, а веласіпед выкарыстоўвала замест хадункоў, распавялі прадаўцы.

— Веласіпед без шын, на абадах. Мы заўсёды на дарозе спыняліся, яна далей дайсці не магла. А мы не маглі пад'ехаць бліжэй: дарогі не было. Гаспадарка пераворвала поле каля яе дома і пакідала бабулі толькі вузкую сцежку. Вось летам па гэтай сцежцы праз кукурузу яна і выходзіла да нас са сваім веласіпедам. А зімой мы самі з кіроўцам насілі ёй прадукты: ведалі, што яна звычайна бярэ. Аляксееўна ёй накладвала сумку і насіла або кіроўцу адпраўляла аднесці.

Не абавязаныя?.. Вядома, не абавязаныя! Але, кажуць жанчыны, як жа не прынесці бабулі прадукты — проста па-чалавечы?

— А ў Бабінцы цяпер таксама адна бабуля засталася на ўсю вёску. Там восенню ці вясной аўтакрама праехаць не можа — бяром УАЗік або «Жыгулі» і вязём ёй асобна прадукты. Часам старых дзеці на зіму забіраюць у горад. Але многія не хочуць ехаць катэгарычна. «Тут мая хатка, тут я і буду». Тая бабуля, што з веласіпедам, так і памерла ціха ў сваёй хатцы. Паштальён яе знайшоў. Бабуля з Бортнавічаў таксама сядзіць адна ў вёсцы — і нікуды. Ездзім да яе двойчы на тыдзень. А яна купляе толькі хлеб і малако...

Праца аўтакрам стратная па азначэнні. У маленькіх вёсках засталіся пенсіянеры, якія робяць мінімальныя пакупкі.

— Рознічныя цэны ў аўтакрамах і «стацыянарных» крамах не адрозніваюцца. У нас 18 працэнтаў гандлёвая надбаўка па арганізацыі. Але на пакрыццё працы аўтакрам гэтага не хапае, — кажа дырэктар філіяла «Колас». — Транспартныя выдаткі, заробкі прадаўцоў плюс у іх пастаянная перапрацоўка. А даходнай часткі ў дзень не хапае на пагашэнне нават транспартных выдаткаў. Каб перакрываць усё гэта, нацэнка павінна быць працэнтаў 40, напэўна. Так што аўтакрамы — гэта сацыяльная функцыя, якая кладзецца на плечы райспажыўтаварыства. Гэтыя выдаткі даводзіцца пагашаць іншымі відамі дзейнасці. У любым выпадку крамы ў вёсках з некалькімі жыхарамі будуць закрывацца, і мы адразу пускаем туды аўтакраму, — кажа Алена Мікалаеўна.

Па дарогах Пружаншчыны аўтакрама праязджае ў дзень больш за 100 кіламетраў.

ПРА КАТА І КАЎБАСУ

Акрамя прадуктаў харчавання, прадаўцы прымаюць ад насельніцтва заказы і прывозяць пенсіянерам з горада самыя розныя тавары. А часам і лекі, хоць у задачы аўтакрамы гэта не ўваходзіць. Аўтакрамы — не сацыяльная служба. Але жыццё ўносіць карэктывы...

— Возім і цэмент, і руберойд па замове. І шклабанку па папярэдніх заяўках у сезон закатак. І лекі — людзі рэцэпты даюць. Заязджаем, купляем. Гэта ўжо адхіленне ад маршруту, але калі старэнькі чалавек просіць — як адмовіць? Бывае, замовілі нешта такое, чаго не знайсці, а бабулі трэба тэрмінова. Забяжыш па шляху, купіш на свае грошы і завязеш. Яны нам тэлефануюць — у іх ёсць нашы тэлефоны. Сёння ўжо з сямі раніцы мне тэлефанавалі, — кажа Дар'я.

...Далёка не ўсе гісторыі ў прадаўцоў сумныя. Наадварот, большасць вясёлых. Напрыклад, як кот скраў з сумкі каўбасу.

— Пакупнікі ставяць сумкі каля ног і расплачваюцца або размаўляюць. Вось бабуля паставіла так сумку і разлічваецца. А кот за каўбасу — і пацягнуў. Да плота дацягнуў, а праз дзірку не можа: зачапілася каўбаса. Я заўважыла, крычу: «Каўбасу вашу скралі!». Пабеглі адымаць, кот кавалак адарваў — і бегчы. Але палову каўбасы пакупніца ўсё ж забрала дадому, — распавядае Дар'я.

У тэлефонах прадаўцоў аўтакрам зашмат пацешных фота і відэа. Напрыклад, як у пакупніцы два рублі пад машыну закаціліся, і прадавец з кіроўцам лазілі шукаць. Ці як частуюць «сваіх» прадаўцоў пажылыя вяскоўцы.

— Ой, частуюць! — смяюцца суразмоўніцы. — І піражкамі, і дранікамі, і закаткамі, і грыбамі, і яйкамі. Наліўкамі хатнімі нават імкнуцца пачаставаць. І з днём нараджэння заўсёды віншуюць.

— Мне на дзень нараджэння пакупнікі кошык прыгожы падарылі, — кажа Дар'я.

— А адкуль яны даведаліся, калі ў вас дзень нараджэння?

— Адна бабуля ў інтэрнэце паглядзела і потым усім патэлефанавала, — смяецца дзяўчына. — Яны ў нас сучасныя!

— А дзядулі ў маленькіх вёсках засталіся?

— Ёсць і дзядулі, але мала. Мужчын наогул на вёсцы менш, чым жанчын...

— Дзядулі не такія патрабавальныя, — адзначае Алена Старко. — Колькі працую, дзядулі ні разу не патэлефанавалі з прэтэнзіямі — толькі бабулі. Часцей за ўсё патрабуюць перанесці прыпынак або дадатковы зрабіць. Або пашырыць асартымент.

Стаіць у кожнай вёсцы аўтакрама ад 10—15 хвілін да гадзіны — у залежнасці ад колькасці пакупнікоў. У вялікіх вёсках «крама на колах» робіць часам 5-6 прыпынкаў.

— Тэлефануюць, плачуць: не магу дайсці, хаджу з палачкай. Мы працуем з сельвыканкамамі, яны лепш ведаюць сваіх жыхароў. Таму што адна бабуля яшчэ можа трымаць свіней і прыпынак каля свайго дома патрабуе — у школу іншай, якая сапраўды не можа дайсці. Вось мы з мясцовай уладай і раімся — вызначаемся, дзе рабіць дадатковыя прыпынкі, — распавядае дырэктар філіяла.

ШТО ПРЫВОЗІЦЬ АЎТАКРАМА

Асартымент аўтакрам — у першую чаргу сацыяльна значныя прадукты. А людзям яны і патрэбныя, распавялі мне. Але не толькі. Кожны прадавец, ведаючы густы пастаянных пакупнікоў, дадае ў свой асартымент пэўныя гатункі каўбас, малочкі, кандытаркі.

— Вядома, памятаем, хто што бярэ! А як інакш, калі бабуля прыходзіць і кажа: «Дай ты мне той каўбасы, што я мінулы раз брала», — тлумачыць Дар'я.

— Мы ведаем, хто што любіць: тваражкі, сыркі, малачко. Нехта любіць смятану тлусцейшую, нехта «пятнаццатку», аднаму падабаецца заварны хлеб, другому — «кірпічык». І мы ўжо памятаем, каму што прывезці, — дадае прадавец Алена.

— Шмат бяруць каўбас. Мы заказваем іх у трох мясакамбінатаў, яшчэ райспажыўтаварыствы з Івацэвіч і Іванава нам каўбасы прывозяць. І, бывае, на тыдзень не хапае.

Прадаўцы кажуць, што за адну паездку 50 кілаграмаў каўбасы сыходзіць.

— І галубцы возім, і катлеты, і каўбаскі, і адбіўныя. Адбіўныя наогул добра раскупляюцца — людзі бяруць на чатыры пачкі ў адны рукі. Пажылым людзям цяжка гатаваць, вось і купляюць паўфабрыкаты, — расказвае Дар'я. — Малочкі глядзіце колькі — не ў кожнай сельскай краме такі асартымент! І, галоўнае, усё свежае, таму што высокі абарот. Кандытарка, макароны, крупы... Ёсць і гарэлка, і каньяк. Гэта ўжо больш для дачнікаў.

Сярэдні чэк у аўтакраме — ад 30 да 50 рублёў. Нямала, вядома, старых, якія на сябе грошы шкадуюць: толькі батон і малако, кажуць прадаўцы. Але шмат і тых, хто наогул не глядзіць на цану — ім не важна, ці дарагі тавар, калі ён спадабаўся. Здараецца, бабулі не могуць палічыць грошы і проста даюць кашалёк — бяры, колькі трэба па чэку. Настолькі вялікі давер да «сваіх» прадаўцоў. Але бываюць, вядома, і скаргі.

— З дачнікамі працаваць больш складана. Ёсць капрызныя — такія звычайна з вялікіх гарадоў прыязджаюць: з Мінска, з Брэста. І асартыменту ім недастаткова, і няма нейкіх навінак, і дорага, хоць у нас гандлёвая нацэнка такая ж, як у стацыянарных крамах. Адна дачніца была незадаволеная: маўляў, хлеб занадта мяккі, а ёй патрэбен чэрствы, яна на дыеце, распавядаюць жанчыны.

Людміла Нікалайчук, якая адпрацавала ў аўтакраме 20 гадоў, успамінае, як калісьці ў машынах не было вітрын, а замест халадзільнікаў прадаўцы замарожвалі ваду ў пластыкавых бутэльках і ставілі ў скрыні, каб летам не псаваліся малако і каўбаса.

— Тады ў нас было ўсяго дзве аўтакрамы. Асартыменту не было ніякага, толькі самае неабходнае. Ні смятаны, ні сыркоў, 1-2 віды каўбасы.

Цяпер, кажуць прадаўцы, пакупнікі сталі распешчаныя, а стаўленне да жыцця і навакольных у вялікіх гарадах у многіх людзей спажывецкае.

— Прыязджыя патрабуюць ад нас асартымент буйных гіпермаркетаў. Але мы ж не можам столькі тавару прывозіць! Людзі не разумеюць, як усё гэта робіцца...

Ёсць, вядома, «складаныя» пакупнікі і сярод мясцовых.

— Амаль у кожнай вёсцы ёсць чалавек, аб якім ведаеш, што з ім трэба быць як мага далікатнейшым, — тлумачыць Аксана.

Але сярод вяскоўцаў такіх — адзінкі, кажуць дзяўчаты. З надыходам халадоў раз'едуцца дачнікі. А хутары і вёсачкі працягнуць жыць сваім мерным, ціхім жыццём, у якім прыезд аўтакрамы — вялікая падзея і нагода сустрэцца з суседзямі.

— Па прабітых чэках колькасць пакупнікоў не палічыш, — адзначае Аксана. — Таму што людзі падыходзяць на некалькі разоў. Нешта забыліся купіць, а па дарозе дадому ўспомнілі. Або адыдзе бабулечка, спыніцца з суседкай: «А што ты ўзяла? Ой, і мне ж трэба!» — і вяртаецца...

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 6 (69)

Далучайцеся!

У ЗЕЛЕНІ — ГАРАДЫ І ВЁСКІ

Мінпрыроды запрашае жыхароў Беларусі ўзяць удзел у асеннім месячніку па азеляненні

Ён стартаваў 17 верасня — у Дзень народнага адзінства. Гэта дата выбрана невыпадкова. Як тлумачаць у Мінпрыроды, дзейнасць па азеляненні за шмат гадоў стала адным з сімвалаў яднання жыхароў Беларусі на карысць аднаўлення і захавання прыроды роднага краю.

ДЛЯ НОВЫХ...

Эколагі, прадстаўнікі мясцовых органаў кіравання, грамадскіх аб'яднанняў, жыхары аб'яднаюцца для важнай агульнай справы — палепшыць і стварыць новыя зялёныя тэрыторыі ў гарадах і пасёлках, аграгарадках і вёсках краіны. Падчас месячніка па азеляненні плануецца высадзіць больш за 143 тысячы дрэў і звыш 296 тысяч кустоў.

— Азеляненне і добраўпарадкаванне населеных пунктаў — пытанне, важнае не толькі для прыгажосці і камфорту, але і для здароўя людзей, — кажуць у прэс-службе Мінпрыроды. — Па экспертных ацэнках вучоных, адно дрэва сярэдняй велічыні за 24 гадзіны аднаўляе столькі кіслароду, колькі неабходна для дыхання трох чалавек, а зялёныя насаджэнні па ўсім свеце штогод паглынаюць 600 млрд тон вуглякіслага газу і выдзяляюць у атмасферу 400 млрд тон кіслароду.

Дзякуючы дрэвам і кустам у населеных пунктах становіцца менш пылу і загазаванасці, нармалізуецца ўзровень вільготнасці і адбываецца іанізацыя паветра. А таксама яны выпрацоўваюць фітанцыды — рэчывы, якія знішчаюць бактэрыі. Расліны нейтралізуюць шкодныя злучэнні азоту і серы, зніжаюць узровень гарадскога шуму, могуць выконваць функцыю ветразагароды і зберагаюць ад лішку сонечнай радыяцыі.

За апошнія пяць гадоў у населеных пунктах краіны з дапамогай грамадзян высадзілі больш за 4,2 мільёны дрэў і кустоў. Сёння ў 83 % гарадоў і раёнаў Беларусі ўзровень азялененасці адпавядае экалагічным нарматывам і патрабаванням. Гэта сур'ёзнае дасягненне як на постсавецкай прасторы, так і ў свеце.

...І БЫЛЫХ ПАКАЛЕННЯЎ

Разам з асеннім месячнікам па азеляненні працягваецца і экалагічная акцыя «Дрэва героя». Нагадаем, што ў Год гістарычнай памяці Мінпрыроды ініцыявала закладку паркаў, алей і садоў, пасадку дрэў у памяць аб загінулых воінах у месцах баявых дзеянняў, а таксама догляд ужо высаджаных дрэў. «Дрэвы заўсёды лічыліся сімвалам працягу жыцця, гэта яднанне продкаў і нашчадкаў, надзей будучага і памяці мінулага», — кажуць у Мінпрыроды.

Жыхары Беларусі ахвотна падтрымалі акцыю, чым зрабілі важны ўнёсак у захаванне памяці пра адважных людзей, якія ахвяравалі сваімі жыццямі дзеля міру на нашай зямлі. «Дрэва героя» можна будзе пасадзіць і на працягу асенняга месячніка па азеляненні.

Узяць удзел у месячніку і акцыі можа кожны ахвотны. Для гэтага неабходна звярнуцца ў любы тэрытарыяльны орган Мінпрыроды. Спецыялісты раскажуць, як менавіта можна стаць удзельнікам мерапрыемстваў, арганізуюць пасадкі драўнінна-хмызняковай расліннасці на землях агульнага карыстання населеных пунктаў і забяспечаць пасадачным матэрыялам і інвентаром.

Настасся АЛЯКСЕЕВА.

Кантакты тэрытарыяльных органаў Мінпрыроды:

— **Брэсцкі** абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя — 8(0162) 25-12-69;

— **Віцебскі** абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя — 8(0212) 24-74-40;

— **Гомельскі** абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя — 8(0232) 23-24-91;

— **Гродзенскі** абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя — 8(0152) 62-01-60;

— **Мінскі** абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя — 8(017) 375-54-54;

— **Магілёўскі** абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя — 8(0222) 64-79-01;

— **Мінскі гарадскі** камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя — 8(017) 350-88-48.

Водная стратэгія

Для ацэнкі патэнцыялу вады і наступстваў для яе з-за змены клімату патрэбны вывераныя дзеянні

Нацыянальная стратэгія кіравання воднымі рэсурсамі да 2030 года скіравана на павышэнне эфектыўнасці выкарыстання водных рэсурсаў для забеспячэння ўстойлівага эканамічнага росту краіны ва ўмовах клімату, які мяняецца, а таксама стварэння ўмоў для захавання водных экасістэм. Прысваенне экастатусу рэкам і азёрам дазваляе сачыць за іх якасцю, а нарміраванне забруджвання сцёкавых вод спрыяе кантролю іх ачысткі. Што заканадаўча робіцца ў Беларусі для аховы водных рэсурсаў, расказалі эксперты воднай галіны.

Алена ГРАМАДСКАЯ, начальнік аддзела паверхневых вод Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў, адзначае:

— Водная стратэгія навукова абгрунтаваная і ўзгоднена без заўваг 24 органамі дзяржкіравання. У яе межах ацэнены сучасны патэнцыял водных аб'ектаў і дынаміка водакарыстання за апошнія пяць гадоў. Аналіз дынамікі водакарыстання ўказвае на яго стабільнасць у краіне. Аднак плануецца павелічэнне здабычы вод з прыродных крыніц за кошт уводу ў эксплуатацыю і выхаду на праектную магутнасць шэрагу буйных прадпрыемстваў.

Сельская гаспадарка і нецэнтралізаваная пітная вада — у зоне рызыкі

У Воднай стратэгіі таксама прыводзяцца факты змянення клімату і магчымыя наступствы. Так, у краіне назіраецца спад узроўню грунтавых артэзіянскіх вод у сярэднім да 0,3 метра, аднак у паўднёвых раёнах Беларусі ён можа дасягаць аднаго метра, паведаміла спецыяліст:

— Паколькі са змяненнем клімату павышаецца верагоднасць наступлення малаводных перыядаў, павялічваецца рызыка змяншэння сцёку малых рэк пры зніжэнні ўзроўню вады і, магчыма, пагаршэнне якасці вады. Чакаецца рэзкая дыферэнцыяцыя па аб'ёме рачнога сцёку паміж паўночнай і паўднёвай часткамі краіны.

Дэфіцыт вады для прамысловасці ў краіне малаверагодны дзякуючы добрай забяспечанасці падземнымі водамі. Аднак можа існаваць пагроза для суб'ектаў гаспадарання, якія карыстаюцца водамі з паверхневых крыніц, напрыклад сельскай гаспадаркі. У зоне рызыкі можа аказацца і эксплуатацыя нецэнтралізаваных сістэм гаспадарча-пітнога водазабеспячэння ў населеных пунктах (з-за паніжэння ўзроўню грунтавых вод).

Ачыстка, паўторнае выкарыстанне, добраўпарадкаванне

Воднай стратэгіяй сфармуляваны праблемы кіравання воднымі рэсурсамі, якія патрабуюць вырашэння. Так, напрыклад, сельскагаспадарчыя землі — асноўная крыніца разгрупаванага забруджвання, паколькі праз змыў угнаенняў з палёў шкодныя рэчывы трапляюць у паверхневыя водныя аб'екты. Таму стратэгіяй прапануецца інвеставаць у сучасныя метады ачысткі сцёкавых вод. А паўторнае выкарыстанне ачышчаных сцёкавых вод — найбольш пажаданы варыянт для сельскагаспадарчага арашэння, рыбнай гаспадаркі, а таксама прымянення ў прамысловасці, абазначыла Алена Грамадская:

— Водная бяспека краіны немагчыма без работы па інфармаванні і адукацыі насельніцтва. У першую чаргу неабходна падтрымліваць сацыяльныя праекты, скіраваныя на аднаўленне малых рэк, добраўпарадкаванне крыніц, забеспячэнне насельніцтва неабходнай інфармацыяй пра стан паверхневых водных аб'ектаў, арганізацыю тэматычных форумаў, семінараў, канферэнцый і выстаў.

У 2020 годзе ўступіла ў сілу пастанова Мінпрыроды аб пацвярджэнні экалагічных норм і правіл па добраўпарадкаванні паверхневых водных аб'ектаў. Дакументам прадугледжаны комплекс мерапрыемстваў, неабходных падчас такіх работ. Аднак асноўная яго мэта — скіраванасць на падтрымку паверхневых водных аб'ектаў у належым стане. Распрацоўваецца комплекс мерапрыемстваў у выпадку, калі па выніках даследаванняў іх стан не адпавядае добраму або выдатнаму экалагічнаму статусу.

— Крыніцы — найбольш уразлівыя да антрапагеннага ўздзеяння водныя аб'екты. Пры іх добраўпарадкаванні выключаецца стварэнне масавых месцаў адпачынку з доўгачасовым знаходжаннем. А таксама правядзенне бліжэй за 300 метраў работ любых механізмаў на зямлі, у тым ліку помпавага абсталявання, — нагадала прадстаўніца інстытута. *— Добраўпарадкаванне крыніц у межах гідралагічных помнікаў прыроды павінна адбывацца ў адпаведнасці з рэжымам аховы і выкарыстання.*

Ацэнка і прысваенне экастатусу

Практыка прысваення экалагічнага статусу (экастану) паверхневым водным аб'ектам у Беларусі пачалася ў 2014-м. А летась напрыканцы года запрацаваў новы метадычны дакумент Мінпрыроды «Парадак аднясення паверхневых водных аб'ектаў і іх частак да класаў экалагічнага стану (статусу)», які быў створаны ўзамен шасці дакументаў, што існавалі раней, паведаміла **Марына ЛЕМУТАВА, намеснік начальніка службы экалагічнай інфармацыі Белгідрамета:**

— Падыходы да ацэнкі экастатусу паверхневых водных аб'ектаў засталіся ранейшыя, але былі дапрацаваны ў некаторых частках. Асноўны падыход — экастатус вызначаецца на падставе гідрабіялагічных паказчыкаў з выкарыстаннем гідрахімічных і гідрамарфалагічных. Гэтым паказчыкам паасобку прысвойваюцца класы экалагічнага стану.

Экалагічных класаў якасці пяць: выдатны, добры, здавальняльны, кепскі, вельмі кепскі. Для прысваення экалагічнага класа якасці рэкам выкарыстоўваюцца гідрабіялагічныя паказчыкі: макразаабентас (сукупнасць беспазваночных жывёл, якія насяляюць дно) і фітаперыфітон (спецыфічная экалагічная групоўка водарасцяў), а азёрам і вадасховішчам — фіта- і зоапланктон. Гідрамарфалагічныя паказчыкі характарызуюць стан рэчышча, берагоў, берагавых зон, пойм, і кожнаму з іх прысвойваюцца балы, патлумачыла спецыяліст.

Дапушчальнае забруджванне ў сцёкавых водах

У лютым 2022-га асобна быў выдзелены з агульнага ЭкаНіПа па экалагічнай бяспецы дакумент, якім вызначаюцца нарматывы скіду забруджвальных рэчываў у складзе сцёкавых вод. Для разліку дапушчальнага скіду выкарыстоўваецца таксама інструкцыя, распрацаваная ў 2017-м. Гэтыя дакументы ўзаемадапаўняльныя, акрэсліла **Кацярына ГАПАНОВІЧ, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі.**

